# ЗАПРАШАЕМ НА ДЭГУСТАЦЫЮ!

Некалькі дзён таму наш карэспандэнт вярнуўся са службовай камандзіроўкі. Ён з захапленнем распавядаў пра нашу слаўную сталіцу, горад Мінск. Зайшла гаворка і аб адносна новай для беларусаў з’яве - сталічных гіпермаркетах.

У адным з іх наш карэспандэнт узяў удзел у вельмі незвычайнай, але прыемнай справе: адкрытай дэгустацыі новых алкагольных напояў беларускай вытворчасці. Дзесяткі і сотні людзей падыходзілі на вясёлыя зазовы прыгожых дзяўчат, апранутых у старадаўнія беларускія строі: “Ад бабулі і дзядулі пакаштуйце Крамбамбулі!”. Дзяўчаты ласкава прапаноўвалі пакаштаваць шматлікія гатункі напою і паставіць свае адзнакі ў спецыяльнай анкеце. Была вельмі цікавая магчымасць пачаставацца зробленымі дзяўчатамі кактэйлямі. На заканчэнне сваёй прамовы наш карэспандэнт горда прадэманстраваў набытую ў сталіцы бутэльку незвычайнага напою.

Мы навялі даведкі аб прадпрыемстве-вытворцы - кампаніі Белпі. Інтэрнэт даў хуткі адказ: “Белпі” азначае “Беларускае пітво” (па-руску - “питьё»), а сама кампанія знаходзіцца ў прыгожым экалагічна чыстым Смалявіцкім раёне, што непадалёку ад Мінска, і займаецца вытворчасцю моцных напояў ужо больш за 16 год! Тэрмін, пагадзіцеся, немаленькі.

Мы хутка патэлефанавалі на прадпрыемства-вытворцу (на шчасце, на кожнай бутэльцы ёсць тэлефон “гарачай лініі спажыўцоў”).

Гаворку з намі шчыра распавёў намеснік дырэктара па вытворчасці Зміцер Дайнека:

- Францыя славіцца сваім каньяком і шампанскім. Іспанія славіцца сваімі вінамі. Германія - півам. Расія - гарэлкай. Чым жа славіцца наша Беларусь?

Яшчэ год таму для нашай краіны востра стаяла пытанне адсутнасці свайго нацыянальнага алкагольнага брэнду, напою, якім не сорамна пачаставаць па добрай нагодзе і сяброў, і замежных гасцей. Некаторыя вытворцы кінуліся выдумляць нейкія штучныя назвы, рабіць няхай і бліскучыя, але пустыя ў ідэйным плане этыкеткі і бутэлькі, з прэтэнзіяй на нейкую “беларускасць”.

Трэба проста добра ведаць беларускую гісторыю. Беларускі народ - гэта частка еўрапейскай культуры са шматвекавой гісторыяй. Ці кожны беларус ведае, што імем нашага нацыянальнага героя - генерала Касцюшкі - названа самая высокая гара Аўстраліі, а таксама безліч вуліц і праспектаў амаль на кожным кантыненце? А фрэскавы партрэт Францыска Скарыны вісіць у італьянскім універсітэце Падуі побач з партрэтам Галілея, яшчэ аднаго славутага выпускніка гэтай альма матар? І такіх фактаў вялікае мноства.

Таму нашае прадпрыемства паставіла сабе мэту - аднавіць старадаўнія рэцэпты і стварыць сапраўдны беларускі нацыянальны напой. Шмат год працягвалася праца ў бібліятэках, архівах, сямейных сховішчах, вяліся пошукі старадаўніх рэцэптаў. Потым - напружаная праца з самымі вопытнымі майстрамі-тэхнолагамі, пошук выключна натуральных інгрэдыентаў, якія сапраўды выкарыстоўваліся ў даўніну, падбор унікальных гатункаў, якія могуць задаволіць абсалютна разнастайныя густы нашых пакупнікоў. Асобнае пытанне - распрацоўка дызайну. Таленавітая дзяўчына-мастак, вобразна кажучы, ўдыхнула жыццё ў кожную бутэльку - зрабіла цудоўныя

замалёўкі са штодзённага старажытнага жыцця. І зараз мы з годнасцю канстатуем - як і ў часы нашых продкаў, стагоддзі таму, так і сёння і ў будучым, мы можам пакаштаваць сапраўды сваю - славутую беларускую Крамбамбулю!

Культура ўжывання Крамбамбулі - вельмі важнае для нас пытанне - працягвае гаворку прадстаўнік кампаніі-вытворцы. - Гэта сапраўды высакародны напой, таму мы прапануем ужываць яго не толькі ў "чыстым" выглядзе, але і ў складзе вытанчаных express кактэйляў, распрацаваных лепшымі бармэнамі Беларусі. Састаў кожнага кактэйля спажывец можа знайсці на бліскучым ярлыку, які маецца на кожнай бутэльцы. Там жа можна даведацца і пра выбраны "кавалачак" багатай гісторыі нашага беларускага народу з літаратурнай замалёўкі вядомага беларускага пісьменніка Леаніда Дайнекі, які справядліва лічыцца адным з заснавальнікаў беларускага гістарычнага рамана. Іншаземцы з усяго свету на сваёй роднай мове здолеюць даведацца больш пра нашую цудоўную краіну - на кожнай бутэльцы ёсць тэксты на 14 мовах свету!

На гэтым скончылася пазнавальная і вельмі цікавая размова з прадстаўніком кампаніі. Ну што ж, шчыра пажадаем поспехаў сапраўды нацыянальнай кампаніі Белпі - Беларускае пітво. Таксама рэдакцыя віншуе ўвесь калектыў прадпрыемства з перамогай на апошнім міжнародным конкурсе-дэгустацыі, дзе гатункі Крамбамбулі атрымалі залатыя медалі і дыплом за лепшы дызайн, што яшчэ раз падцвердзіла самую высокую якасць беларускага нацыянальнага напоя. Дзякуючы намаганням таленавітага калектыву кампаніі Белпі, легендарная Крамбамбуля вярнулася ў беларускі дом, на беларускі стол!

P.S. І самае галоўнае - дзякуючы нашаму тэлефанаванню, кампанія Белпі вырашыла правесці адкрытую дэгустацыю Крамбамбулі і ў нашым родным Брэсце. Расклад дэгустацый Крамбамбулі, якія ажыццяўляюцца ў маркетынгавых мэтах і пройдуць у бліжэйшы час у Брэсце, наступны: 23.04.2009 з 16 да 20 гадзін, 24.04.2009 з 16 да 20 гадзін і 25.04.2009 з 11 да 15 гадзін. Нагадваем, што згодна з патрабаваннямі ўдзельнікі дэгустацыі павінны мець узрост болей за 21 год. Пры сумненнях неабходна прад'явіць дакумент, які можа падцвердзіць узрост. Запрашаем на дэгустацыю!